# ФІЛАСОФІЯ ЯК ІНСТРУМЕНТ АБГРУНТАВАННЯ РЭЛІГІЙНЫХ ПРАЎД У ТВОРЧАСЦІ В. БУЧЫНСКАГА

*Г. І. Клімовіч*

Асноўная тэма дадзенага спавешчання – гэта асэнсаванне ўзаемадзеяння праўд рэлігіі і філасофіі ў творчай спадчыне аднаго з найбольш аўтарытэтных прадстаўнікоў неасхаластычнай традыцыі на тэрыторыі Беларусі, якая развівалася ў межах Полацкай езуіцкай акадэміі – В. Бучынскага.

Першая палова XIX стагоддзя была на подступах да канца класічнай філасофскай традыцыі. Безумоўна, у гэты час магутныя метафізічныя сістэмы яшчэ працягвалі існаванне, але знаходзіліся ў стане крызісу, перажываючы перыяд «паўраспаду». Дадзеная з'ява паслужыла штуршком да пошуку новых магчымасцей і сэнсаў, у тым ліку і ў праблемным полі рэлігійнай філасофіі. Гэты феномен прысутнічаў таксама ў айчыннай філасофскай і сацыяльна-палітычнай думцы: мысляры займаліся напружаным пошукам ідэй, якія маглі б стварыць адзіную каштоўнасную аснову. Адным з такіх вырыянтаў была спроба сінтэзу рэлігіі і філасофіі, базісам якой было імкненне аб'яднаць праўды філасофіі і рэлігіі. Шэраг такіх ідэй быў вылучаны ў часопісах Atheneaum, Miesięcznik Połocki, таксама падобныя праграмныя ўстаноўкі можна знайсці ў трохтомнай працы М. Якубовіча «Філасофія хрысціянскага жыцця ў параўнанні з пантэістычнай філасофіяй нашага часу». Прадстаўляе навуковы інтарэс у гэтым аспекце і работа выпускніка Полацкай езуіцкай акадэміі, а таксама яе прафесара, філосафа неасхаластычнай накіраванасці – Вінцэнтыя Бучынскага «Пачаткі рэлігійнай дактрыны, у якой філасофскія прынцыпы прыменены да рэлігійных ісцін» (Institutiones doctrinae religionis, in philosophica ad veritates religionis applicantur conscriptae). Дадзеная работа яшчэ не станавілася прадметам навуковага даследавання гісторыкаў філасофіі, адначасова яна ўтрымлівае шэраг арыгінальных ідэй, якія падкрэсліваюць самабытнасць філасофіі В. Бучынскага і патрабуюць далейшай увагі з боку даследчыкаў.

Відавочна, што адна з асноўных праблем, якая своеасаблівым

маркерам праходзіць праз усе творчыя пошукі В. Бучынскага – гэта праблема, што сыходзіць каранямі яшчэ ў сярэднявечную схаластыку, а менавіта: узаемаадносіны праўд рэлігіі і філасофіі, ці, як варыянт, веры і Адкрыцця. Здавалася б, яшчэ ў эпоху росквіту схаластыкі былі асэнсаваны асноўныя магчымыя варыянты гэтага саюза, але канец XVIII – пачатак XIX стагоддзяў, якія адзначыліся шматлікімі падзеямі, што назаўжды змянілі інтэлектуальны ландшафт Еўропы, сталі новым выклікам для тэолагаў і рэлігійных філосафаў. Рэзкая крытыка схаластычнага стылю мыслення, скасаванне ордэна езуітаў, вольнадумства і атэістычная Французская рэвалюцыя прымусілі аўтараў, якія належалі да рэлігійна-філасофскага кірунку, абараняцца і шукаць новыя шляхі ажыўлення афіцыйнай філасофскай дактрыны каталіцкай царквы. Гэтае пытанне таксама стала адным з цэнтральных для творчай спадчыны В. Бучынскага.

Асаблівасць падыходу дадзенага аўтара ў адносінах да філасофіі заключаецца ў сцвярджэнні яе практычнай накіраванасці. На думку полацкага акадэміка, філасофія не можа існаваць сама па сабе і дзеля самой сябе, яна павінна прыносіць карысць грамадству, а таксама рабіць чалавека шчаслівым. У супрацьлеглым выпадку яна павінна разглядацца як «філаманія», следствам якой з’яўляецца заняпад як асобы, так потым і грамадства. Карысць філасофіі для грамадства, на думку В. Бучынскага, заключалася ў фарміраванні грамадзяніна сваёй дзяржавы, адной з характэрных рыс якога была рэлігійнасць. Такім чынам, практычная каштоўнасць філасофіі для В. Бучынскага ў першую чаргу звязана з дапамогай ў фарміраванні грамадзянскай самасвядомасці з дапамогай рэлігійнага светапогляду.

Узаемадзеянне рэлігіі і філасофіі, на думку В. Бучынскага, магчыма, калі мэтай філасофіі будзе, як і ўселякага мастацтва і вучэбнай дысцыпліны – садзейнічаць лепшаму засваенню рэлігійных праўд [1, с. 1]. Такое прызначэнне філасофіі можа быць растлумачана тым, што ўся сістэма адукацыі ордэна езуітаў мела рэлігійны характар, адпаведна, філасофія не магла вывучацца як аўтаномная дысцыпліна.

Згодна схаластычнай традыцыі існуюць праўды рэлігіі і праўды філасофіі. Праўдамі рэлігіі з'яўляюцца тыя, што могуць быць спазнаны з дапамогай веры, філасофскія праўды адкрываюцца з дапамогай натуральнага розуму. І менавіта натуральны розум становіцца першым краевугольным каменем даследавання В. Бучынскага. Натуральны розум або натуральнае святло розуму – тэрмін, уведзены ў філасофію Тамашам Аквінскім. Ён ужываўся анёльскім доктарам для апісання здольнасці актыўнага інтэлекту рабіць выявы розума пазнавальнымі праз устанаўленне агульнага для іх зместу. Сам В. Бучынскі выкарыстоўвае больш сучасны яму тэрмін – lumen rationis (святло розуму), што, відаць, адпавядае тэрміну lumen naturale rationis, які з'яўляецца натуральнай здольнасцю розуму [2, с. 90]. Ужыванне дадзенага паняцця азначае, што

нешта можа быць спазнана натуральным шляхам, гэта значыць, па-за Адкрыццём.

Класічным варыянтам праўды, якая можа быць спазнана як праз Аб'яўленне, так і натуральным шляхам, з'яўляецца існаванне Бога. Па В. Бучынскаму, натуральнае святло розуму здольнае працаваць у гэтым кірунку, дазваляючы спазнаць Бога. На думку полацкага філосафа, непасрэдна са святлом розуму звязаны і доказ быцця Бога Тамаша Аквінскага з прычыннасці, якая атаясамліваецца ў В. Бучынскага з магчымасцю назіраць у свеце як прычынна-выніковыя сувязі.

Таксама В. Бучынскі праз прызму паняцця святла розуму разглядае і доказы Тамаша Аквінскага ад мэтазгоднасці і ад прычыннасці [1, с. 8]. Але яго філасофію нельга разглядаць толькі як прытрымліванне тамістычнай сістэмы поглядаў. Па-першае, В. Бучынскі спрабуе прымяніць доказ існавання Бога Тамаша Аквінскага ў кантэксце гістарычнай сітуацыі XIX стагоддзя, а, па-другое, ён не спыняецца толькі на тых, што існуюць, а прапануе свой. Арыгінальнасць дадзенага доказу заключаецца ў самой яго падставе – ён пабудаваны на выкарыстанні паняцця натуральнага права [1, с. 223].

У гэты перыяд існавала дастаткова вялікая колькасць трактовак паходжання натуральнага права. Для В. Бучынскага яно выступае як вынік злучэння вышэйшай волі Абсалюту і чалавечага розуму. Аб гэтым ён піша ў сваёй працы «Пачаткі філасофіі» [3, с. 41]. Паколькі, як мы бачым, натуральнае права немагчымае без садзейнічання чалавечага права, то, згодна пункту гледжання аўтара, яно цалкам можа быць выкарыстана ў якасці яшчэ аднаго шляху зразумення існавання Абсалюту інтэлектуальным шляхам: «Больш таго, Бог, творца прыроды, напісаў у сэрцах нашых закон Свой, як кажа апостал, і явіў яго святлом самога розуму... Такім чынам, усё, што загадваецца ці забараняецца натуральным законам, адносіцца і да абавязкаў хрысціяніна» [3, с. 223].

Такім чынам, статус філасофіі асэнсоўваецца В. Бучынскім не толькі ў класічным схаластычным кірунку, у аснове якога ляжыць ідэя аб наяўнасці рацыянальных шляхоў існавання Бога (доказы існавання Бога), распрацаваных яшчэ Тамашам Аквінскім. В. Бучынскі спрабуе «асучасніць» гэтыя доказы, дзеля гэтага ён звяртаецца да папулярнага ў гэты перыяд напрамку натуральнага права і разглядае звышнатуральнае паходжанне права як яшчэ адзін доказ існавання Абсалюта. Такім чынам, ён як бы замыкае доказы існавання Бога ва ўсёй іх паўнаце – на працягу існавання схаластычнай традыцыі былі метафізічнымі, гнасеалагічнымі, а цяпер да іх дадаўся кірунак, які з'яўляецца элементам як этыкі, так і практычнай філасофіі, роўна як і філасофіі права.

Відавочна, што рэфлексія В. Бучынскага палягала ў рэчышчы неасхаластычнай традыцыі. Разам са зваротам да класічных тэм аўтэнтычнай традыцыі, дзе ён прытрымліваецца ў большай ступені

комплекса ідэй Тамаша Аквінскага, звязаных з канцэптам натуральнага святла розуму, назіраецца арыгінальная трактоўка натуральнага права як аднаго з мыгчымых доказаў існавання Бога. Гэта, у сваю чаргу, азначае адыход ад традыцыйных для схаластыкі шляхоў і пошук новых варыянтаў абгрунтавання рэлігійных праўд, якi быў звязаны са зваротам да тагачасных дасягненняў як ў галіне навуковых адкрыццяў, так і творчых азарэнняў гуманітарыстыкі.

**Літаратура і крыніцы**


1. Buczyński, V. Institutiones doctrinae religionis, in philosophica ad veritates religionis applicantur conscriptae / V. Buczyński. – Viennae, 1842. – 300 p.

2. Климович, А. И. Концепция правопонимания и ее этическое обоснование в творчестве В. Бучиньского / А. И. Климович // Веснік Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта. – 2022. – № 2. – С. 87–93.

3. Buczyński, V. Instutiones philosophicae, pars tertia continens ethicam / V. Buczyński. – Viennae, 1844. – 203 p.

Национальная академия наук Беларуси
Институт философии НАН Беларуси

# ИНТЕЛЛЕКТУАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСИ:
## гуманитарная безопасность в условиях глобальных вызовов

Материалы
Седьмой международной научной конференции
(16–17 ноября 2023 года, г. Минск)

В двух томах
Том 1

МИНСК
ИЗДАТЕЛЬСТВО «ЧЕТЫРЕ ЧЕТВЕРТИ»
2023